# КУЛЬТАВЫЯ ПАБУДОВЫ СТАРОГА БЫХАВА Ў XVI–XVIII стст.

**Галынскі Раман Дзмітрыевіч**
аспірант кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова; магістр гістарычных навук
(г. Магілёў, Беларусь)

Стары Быхаў уяўляе сабой унікальны горад перыяду Новага часу. Гэта звязана як з яго вайсковай гісторыяй, так і з эканамічным і сацыяльна-рэлігійным развіццём. Горад з'яўляўся прыватнаўласніцкім горадам-крэпасцю. Узнікшы ў XIV ст. як феадальная сядзіба Дзмітрыя Семяновіча, паступова перарос у невялікі замак пры Гаштольдах, а пры Хадкевічах і Сапегахператварыўся ў выключны горад-крэпасць. Менавіта знаходжанне ў катэгорыі прыватнаўласніцкіх гарадоў і зрабіла магчымым суіснаванне і развіццё ў адзінай гарадской прасторы прадстаўнікоў некалькіх рэлігійных плыняў, культавым пабудовам якіх і прысвечаны прапанаваны артыкул.

Вялікай колькасцю апрацаваных пісьмовых крыніц прысвечаных Старому Быхаву сучасная беларуская навука не распалагае, таму, асноўная частка інфармацыі па разглядаемаму ў артыкуле пытанню змешчана ў планах горада і разнастайных яго выявах [3–8].

На тэрыторыі Быхава размяшчаліся разнастайныя культавыя будынкі праваслаўных, уніятаў, каталікоў, пратэстантаў і прадстаўнікоў іудаізму (габрэяў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разглядаючы праваслаўныя цэрквы і храмы трэба адзначыць, што ў розныя часы іх было ад трох, да чатырох. Сярод іх былі храм і царква Святога Георгія. На гэта ўказвае адна з гарадскіх слабод – Юраўка і Заюр'еўскі пасад. Храм займаў цэнтральную частку горада, а царква знаходзілася на пасадзе (за абарончымі ўмацаваннямі). Адна з праваслаўных цэркваў была размешчана каля сяла Белая Гара (за Магілёўскай брамай), якое было ў XIX ст. уключана ў склад горада [1, с. 16–24; 2]. Але, факт часовай праналежнасці згаданага сяла да ўласнасці каталіцкага касцёла (сярэдзіна XVII ст.) ставіць пад сумненне рэлігійную прыналежнасць як сялян, так і прыналежнасць культавай пабудовы да той, ці іншай канфесіі.

Каталіцкі касцёл Непарочнага зачацця Дзевы Марыі і Св. Казіміра размяшчаўся на поўнач ад замкавага комплекса. На гравюры Л. Кууро сяр. XVII ст. [1, с. 16–24] касцёл прамаляваны як мураваны будынак. Але, ён перажыў шмат пажараў у сярэдзіне XVII–XVIII стст., што не магло не адбіцца на ягоным абліччы.

Побач з касцёлам знаходзілася Кірха "Латэранскіх канонікаў".Абодва будынка адлюстраваны на гравюры Л. Кууро [1, с. 16–24]. У канцы XVII – пач XVIII стст. кірха была ўжо ў складзе будынкаў касцёла [7] і выкарыстоўвалася як келлі манахаў, з далейшым прыстасаваннем пад жаночую школу/гімназію.

На заходяй ускраіне горада, на гандлёвай плошчы, была пабудавана уніяцкая царква. Ужо ў сярэдзіне XVII ст. яна функцыянавала, бо адлюстравана на гравюры Л.Кууро як будынак са званніцай фахтверкавай канструкцыі.

Адным з нешматлікіх гістарычных горадаўтвараючых дамінантаў з'яуляецца мураваная сінагога. Габрэі атрымалі дазвол на яе будаўніцтва ў 1640-я (прыблізна ў 1648 г.).

Аналізуючы гарадскую планіграфію згодна граюры Л. Кууро (XVII ст.), плану аблогі Быхава войскамі Пятра I ў 1707 г., планах старога Быхава 1778, 1778–1780, 1781 гг., а таксама Спецыяльнай мапе Заходняй часткі Расійскай імперыі генерал-лейтэнанта Шуберта 1826–1840 гг. [3–8; 10, с. 119–123] выпадае казаць пра кампактнае пражыванне прадстаўнікоў канфесій вакол сваіх культавых пабудоў. Пра гэта гавораць і назвы пэўных чатак горада: Юдаўка, Юраўка і Заюраўка.

Наяўнасць мураваный сцяны з кутнімі вежамі і брамай вакол комплекса каталіцкіх пабудоў і абарончыя рысы сінагогі (кутняя вежа і байніцы), дэманструюць нестабільную рэлігійную абстаноўку ў рэгіёне. Гэта магло быць выклікана альбо знешняй пагрозай, прыкладам былі як канфлікты з Севярынам Налівайкам і Мацюшам Федаровічам ў 1590-х, так і магчымасцю ўзнікнення гарадскіх пагромаў [9, с. 80–82]. Але казаць нешта больш канкрэтнае не выпадае з прычыны адсутнасці пісьмовых крыніц закранаючых рэлігійную абстаноўку ў горадзе ў XVII ст.

На тэрыторыі горада існавала трое могілак. На поўдні адны – на тэрыторыі стражытнага гарадзішча, і двое на поўначы – за сялом Белая Гара (хрысціянскае і габрэйскае). Можна казаць пра сацыяльнае размеркаванне могілак. Паўночныя хрысціянскія, хутчэй належалі мяшчанам, тады як могілкі на паўднёвым гарадзішчы належалі мясцовай шляхце (аналагічная сітуацыя прасочваецца ў Полацку, Віцебску і шэрагу іншых гарадоў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да цяперашняга часу з культавых пабудоў захаваліся толькі сінагога і лютэранская кірха. У 1920–1950-я гг. былі зруйнаваны касцёл і Георгіеўская царква. Час знікнення астатніх будынкаў, нажаль, дасканала невядомы.

Наяўнасць касцёла, уніяцкай царквы, пратэстанцкай (лютэранскай) кірхі і праваслаўных цэркваў і храмаў (усяго ў XVI–XVIII стст. – 7 будынкаў) кажа пра даволі шматлікія абшчыны прадстаўнікоў гэтых рэлігійных плыняў як сярод мяшчан, так і сярод насельніцтва рэгіёна. Стары Быхаў з'яўляўся горадам дзе прадстаўнікі гэтых рэлігій суіснавалі, хаця і не заўжды мірна, але пад уплывам добрых эканамічных умоў і пэўных льгот з боку ўладальніка горада і каралеўскіх прывілеяў не імкнуліся яго пакідаць, а знаходзілі кампраміснае вырашэнне ўзнікаючых пытанняў.

**Літаратура**


1. Волкаў, М.А. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. / М.А. Волкаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 5. – С. 16–24.
2. Галынскі, Р.Д. Справаздача аб археалагічным наглядзе на аб'екце “Строительство сетей теплоснабжения к зданию прихода храма Святой Живоначальной Троицы г. Быхова” ў 2013 г. (Дамова Інстытута Гісторыі НАН Беларусі з настаяцелем храма Святой Жыванача́льнай Тройцы г. Быхава ад 26 снежня 2013 г.) / Р.Д. Галынскі // ААНД “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”.
3. План аблогі Старога Быхава расійскім войскамі ў 1707 г.
4. План генеральнага межавання
5. План Старога Быхава 1778 г.
6. План Старога Быхава 1778–1780 гг.
7. План Старога Быхава 1781 г.
8. Спецыяльная мапа Заходняй часткі Расійскай імперыі генерал-лейтэнанта Шуберта 1826–1840 гг.
9. Ткачоў, М.А. Замкі і людзі / М.А. Ткачоў // пад рэд. Г.В. Штыхава. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с. : іл.
10. Чантурия, Ю.В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм / Ю.В. Чантурия. – Мн. : Белорусская наука, 2005. – 375 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова